УДК 711.42

**Сакава Ніна Леанідаўна**
выхавацель даччынага ўнітарнага прадпрыемства
“Дзіцячы санаторый “Свіслач”
(г. Асіповічы, Беларусь)

# ДЗІЦЯЧЫ САНАТОРЫЙ “СВІСЛАЧ” ЯК НАДМУРАК ДА ФАРМАВАННЯ РЭКРЭАЦЫЙНАЙ ЗОНЫ НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ (НРЫСВЯЧАЕЦЦА 50-ГАДОВАМУ ЮБІЛЕЮ ЎСТАНОВЫ)

Даччынае ўнітарнае нрадпрыемства (ДУП) “Дзіцячы санаторый “Свіслач” знаходзіцца на экалагічна чыстай тэрыторыі Беларусі, у самым яе цэнтры і геаграфічным цэнтры кантынентальнай Еўропы, у нрыгожай мясцовасці, нры сутоку



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. Кулешова

рэк Бярэзіны і Свіслачы, у аднайменным паселішчы Свіслач Асіповіцкага раёна. Карпусы дзіцячага санаторыя размешчаны на тэрыторыі двара былой сядзібы Свіслач паноў Незабытоўскіх. Пазней тут працавалі дзіцячы дом і школа-інтэрнат. ДУП "Дзіцячы санаторый "Свіслач" – медыка-педагагічная ўстанова. Дадзены аб'ект і тэрыторыя напоўнены стогадовай энергіяй дзяцінства на грунце аздараўлення, індывідуальнай і калектыўнай творчай радасці і змястоўнай гісторыяй мінулага. Санаторыю сёлета – 50 гадоў. Санаторый – надмурак для стварэння рэкрэацыйнай зоны дзеля будучага росквіту Свіслачы і Беларусі!

Дзеці – сучаснае і будучае жыццёвага ўкладу любой дзяржавы. У Беларусі заўсёдны клопат пра здароўе дзяцей – абавязак бацькоў ці тых, хто часова іх замяшчае. Такая заклапочанасць зацверджана канстытуцыйна. Для паляпшэння фізічнага і псіхалагічнага стану дзяцей у нашай краіне існуюць і рэалізуюцца накірункі праз санаторна-курортнае аздараўленне і лячэнне.

Гісторыя дзіцячага санаторыя "Свіслач", адзінага ў Магілёўскай вобласці і рэспубліцы, які прымае да сябе наведвальнікаў як з Беларусі, так і з Расіі, мае паўвекавую адмеціну. Здраўніца пачала сваё функцыянаванне ў перапрафіляваных карпусах былой Свіслацкай школы-інтэрната ў 1975 годзе. Непадалёк ад санаторыя былі вынайдзены крыніцы з мінералізаванай вадой, якія сёння актыўна выкарыстоўваюцца з дзвюх уласных свідравін пры лячэнні страўнікавых захворванняў, прыняцці ваннаў, у басейне і прыёме ўнутр мінеральнай вады. Па якаснаму складу свіслацкая вада набліжана да міргарадскай, друскінінкайскай і пад. [1].

Даччынае ўнітарнае прадпрыемства (ДУП) "Дзіцячы санаторый "Свіслач" знаходзіцца на экалагічна чыстай тэрыторыі Беларусі, у самым яе цэнтры і геаграфічным цэнтры кантынентальнай Еўропы, у надзвычайна прыгожай мясцовасці, пры сутоку рэк Бярэзіны і Свіслачы, у аднайменным паселішчы Свіслач.

ДУП "Дзіцячы санаторый "Свіслач" – структурнае падраздзяленне санаторна-курортнага унітарнага прадпрыемства "Белпрафсаюзкурорт", якое налічвае ўсяго 13 санаторыяў. Сярод іх – наш адзіны дзіцячы.

Свіслач на працягу мінулых стагоддзяў мела заўсёдны статус цэнтра (удзельнае княства, воласць, раён, сельсавет), цяпер вызначаецца помнікам археалогіі – гарадзішча Свіслач – як сведчанне тут жыцця людзей да нашай эры. Гістарычныя артэфакты занатавалі паселішча Свіслач як сярэдневяковы горад з фартыфікацыяй (замак) [2]. Сёлета, згодна летапісных крыніцаў, мы сведчым пра 360-годдзе ад часоў апошняга



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

спалення Свіслацкага замка казакамі, што былі на службе ў маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча (Раманава). Замак з сярэдзіны XVII ст. ніколі не аднаўляўся.

Карпусы дзіцячага санаторыя размешчаны на тэрыторыі двара былой сядзібы Свіслач. Каля двух стагоддзяў (XVIII – пач. XX стст.) Свіслач была ўласнасцю вядомага роду Незабытоўскіх (герб «Любіч»). Шчырым стаўленнем да жыцця і бездакорным выкананнем службовых абавязкаў у дзяржаве яны зрабілі дастойны ўнёсак у яе структурным кіраванні (Сцяпан Якаўлевіч Незабытоўскі быў прадвадзіцелем дваранства Гродзенскай губерніі. Дзве сядзібы – Вялікая Сваротва і Кайшоўка – меліся ў Незабытоўскіх на Гарадзеншчыне. Дзве – на сучаснай Магілёўшчыне – Гонча і Свіслач). Шмат імі зроблена ў развіцці інфраструктуры мястэчка Свіслач: ад арганізацыі школьнага навучання (школа ў Свіслачы пабудавана ў 1848 годзе на асабістыя сродкі пана Якава Іванавіча Незабытоўскага), да рэканструкцыі і будаўніцтва цэркваў, маста праз раку Свіслач, садзейнічалі ўзвядзенню шклозавода і стварэнню прыродных заказнікаў.

Сёння прыцягваюць увагу турыстаў муры, якія знаходзяцца на Свіслацкім гарадзішчы-замчышчы, на жаль, як сведкі абыякавасці да мінулага. Гэтыя сцены паслужылі дэкарацыямі да мастацкіх кінастужак (напрыклад, фільм «Чорны бусел» рэжысёра Віктара Турава).

Вядома, што апошняй валадаркай сядзібы Свіслач была маркіза Эліза Велёпольская (народжаная Елізавета Сцяпанаўна Незабытоўская). За заслугі перад імперыяй яна ўзнагароджана ордэнам святой Кацярыны. Жанчына не мела шчасця стаць маці родным дзецям, хоць бралася шлюбам двойчы. Аднак, неаспрэчным ёсць факт, што ў былым двары сядзібы Свіслач сто год гаспадараць дзеці (дзіцячы дом, школа-інтэрнат, дзіцячы санаторый) [3].

Пасля падзей 1917 года арандатар сядзібы (гаспадыня пражывала ў Варшаве, вул. Мазавецкая, 7) у цяжкія для народа паслярэвалюцыйныя часы, прапанаваў выкарыстаць нерухомасць валадароў у якасці дзіцячага дома.

Па заканчэнні Вялікай Айчыннай вайны многія падлеткі набылі тут магчымасць спакойнага жыцця ў калектыве. У 60 – 70-ыя гады спецыяльны дзіцячы дом быў рэарганізаваны ў школу-інтэрнат. У 1974 годзе адбылося перапрафіляванне дзіцячай установы. З лістапада 1975 года пачаў функцыянаваць "Санаторны піянерскі лагер "Свіслач". 1991 год замацаваў азначэнне ўстановы як "Дзіцячы санаторый "Свіслач".



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сцвярджаем, што ўказаны аб’ект і тэрыторыя напоўнены стогадовай энергіяй дзяцінства на грунце аздараўлення, індывідуальнай і калектыўнай творчай радасці і змястоўнай гісторыяй мінулага.

ДУП “Дзіцячы санаторый “Свіслач” – многапрофільная лячэбна-прафілактычная здраўніца. Тут ажыццяўляецца лячэнне дзяцей ад 6 да 18 гадоў з захворваннямі органаў дыхання, стрававання і кровазвароту, а таксама – аздараўленне дзяцей з тэрыторый, што пацярпелі ад тэхнагеннай катастрофы на ЧАЭС. Перавага надаецца прыродным лячэбным фактарам (мясцовая мінеральная вада, лячэбныя гразі, клімат і інш.) у складзе з дыетычным харчаваннем, апаратнай фізіятэрапіяй, лячэбнай фізкультурай, масажам і іншымі сродкамі для падтрымання дзіцячага арганізма. Працуе стаматалагічны кабінет, інгаляторый. Да паслуг наведвальнікаў – басейн з мінеральнай вадой. Дзецям арганізавана шасціразовае харчаванне па неабходных дыетах.

Медыцынскімі работнікамі санаторыя раней праводзілася навукова-практычная работа па вывучэнню эфектыўнасці лячэння дзяцей у мясцовых умовах. Кіраваў даследаваннем доктар медыцынскіх навук Ігар Веніямінавіч Васілеўскі (прафесар кафедры клінічнай фармакалогіі УА “Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”) [4]. Даследаванні працягваюць Бараноўскі Дзмітрый Валер’евіч, які нядаўна быў на пасадзе галоўнага ўрача дзіцячага санаторыя, і выхавацель Сакава Ніна Леанідаўна.

Здраўніца абслугоўвае штогод больш за тры тысячы дзяцей з Беларусі і замежжа. Сумесна з дабрачынным Фондам AGGIORNALE LA NOSTRA PRENOTAZIONE (Італія) шмат гадоў ажыццяўляецца санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне дзяцей з тэрыторый Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, якія пражываюць на зямлі, забруджанай ад аварыі на ЧАЭС.

ДУП “Дзіцячы санаторый “Свіслач” – медыка-педагагічная ўстанова, у якой адначасова з лячэннем дзеці навучаюцца па праграме сярэдняй школы і індывідуальнаму вучэбнаму плану, зацверджанаму Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Навучальны працэс ажыццяўляюць педагогі ДУА “Свіслацкая сярэдняя школа” пад кантролем аддзела адукацыі Асіповіцкага райвыканкама. Лячэбныя карпусы, школа, спартыўная зала і пакоі для пражывання злучаны пераходамі, што вельмі зручна.

Педагагічны калектыў санаторыя стварае ўсе ўмовы для камфортнага і раднаснага перабывання дзяцей. Разнастайныя конкурсныя праграмы, віктарыны, квесты, ролевыя гульні, спартыўныя мерапрыемствы, паз-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

навальныя экскурсіі і прагулкі ўзмацняюць жаданне неаднаразовага наведвання санаторыя многімі дзецьмі. Сацыяльныя сеткі садзейнічаюць распаўсюджванню станоўчага вопыту і наступнага прыцягнення жадаючых адпачыць. Санаторый пэўны час падтрымліваў зносіны як з дзецьмі, так і з бацькамі праз тэлеграм-канал "Санаторий Свислочь", дзе кожны мог не толькі пераглядзець фота і відэа, але і наталіць сваю душу ведамі праз інфармацыйны матэрыял і публіцыстычны кантэнт, пра што засведчыла газета "Звязда" [5].

Значны гісторыка-культурны і прыродны патэнцыял населенага пункта і мясцовасці служыць паглыбленню цікавасці ў падлеткаў да навакольнага асяроддзя, выхаванню патрыятызма ў дзяцей на дакладных прыкладах. Свіслач мае тры помнікі:

- ***археалагічны*** як сведчанне жыцця людзей да нашай эры,
- ***архітэктурны*** як паказчык стройнай забудовы ў мінулым,
- ***ваенны*** як памяць пра выхад з Бабруйскага "катла" аперацыі "Баграціён".

Мы прапагандуем веды пра Свіслач як сярод дзяцей, так і ў рабоце міжнародных і рэспубліканскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцый, у сродках масавай інфармацыі, у стварэнні праектаў па адраджэнню Свіслачы (напрыклад, у складзе каманды БГЭУ (філіял, г. Бабруйск) адбылася перамога ў намінацыі "Рэгіён" з праектам па стварэнні гісторыка-турыстычнага цэнтра "Жураўліны Ключ" (Тэхнапарк "Магілёў", 2010)), удзелам у семінарах (напрыклад, Праграма міжмежавага супрацоўніцтва: Латвія-Літва-Беларусь), у конкурсе Нацыянальнага агенцтва по турызму "Пазнай Беларусь" і інш.

У складаны час пандэміі санаторый працягваў сваю работу і па выніках 2020 года заняў першае месца ў галіне санаторна-курортнага лячэння.

Нашы памкненні адзначаны Ганаровай Граматай Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню за высокія паказчыкі ў рабоце – 3 месца сярод санаторыяў (2022).

Калектыў здраўніцы наблізіўся да 50-гадовага юбілею. У нас шмат ідэй для рэалізацыі. Спадзяемся, что сумеснымі намаганнямі як на дзяржаўным узроўні, так і станоўчымі адносінамі кожнага да выканання службовых абавязкаў, і, перш за ўсё, дабрапамысных адносінаў да дзяцей, мы працягнем існаванне сапраўднага аазіса Здароўя, Прыгажосці і Радасці ў непаўторнай Свіслачы дзеля Вечнасці.

Мы працягваем працу, даследуючы гісторыю санаторыя і Свіслачы, і верым, што жыццё нашага аграгарадка абумоўлена існаваннем тут дзіцячага санаторыя як асновы для рэкрэацыйнай тэрыторыі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дзіцячы санаторый размешчаны ў аграгарадку Свіслач, але не знаходзіцца ў рэкрэацыйнай зоне Свіслацка-Бярэзінскага ландшафтнага заказніка, які зацверджаны пэўнымі межамі ў 2015 годзе [6].

Вядома, што адным з першых указаў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па стварэнні рэкрэацыйных зон, падпісаных у 1994 годзе, падавалася і Схема асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторый і аб'ектаў, у якой Свіслач павінна была стацца цэнтрам Свіслацка-Бярэзінскага нацыянальнага парка.

Свіслач па-ранейшаму гатова рабіць важкі ўнёсак у дзяржаўную казну як у сферы аздараўлення, так і турызму. Значны гісторыка-культурны і прыродны патэнцыял паслужыць памнажэнню не толькі ведаў пра мінулае, але і створыць дадатковыя рабочыя месцы – усё дзеля самаўдасканалення і самарэалізацыі чалавека.

Прапагандуючы веды пра Свіслач, мы пазіцыяніруем санаторый як падмурак для стварэння сапраўднай рэкрэацыйнай зоны, жадаючы адраджэння і росквіту Свіслачы, а значыць, спрыяем Будучыні Беларусі.

Нашы жаданні звязаны з дзіцячым фестывальным рухам на аснове даследавання народнай творчасці ў розных праявах і развіцця мастацкіх густаў. Ён будзе звязаны з імёнамі народнай артысткі БССР і СССР Ларысы Пампееўны Александроўскай і народнага мастака БССР Уладзіміра Іванавіча Стэльмашонка. Неабходна імітацыя Свіслацкага замка ў якасці канцэртнай пляцоўкі. Для прыцягнення ўвагі турыстаў пажадана рэалізацыя на мясцовасці міні-карты "Вялікае княства Літоўскае". Фарміраванне экспазіцыі музея Свіслачы і выставачнай залы павінна стацца ў помніку архітэктуры "Былы дом сям'і Яцко" і інш. [7].

Варта заўважыць, што заслужаны хірург БССР Іван Маісеевіч Стэльмашонак – бацька знакамітага мастака – школьнае навучанне атрымліваў у Свіслачы. Медык шмат зрабіў для ўмацавання здароўя дзяцей. Лепшым прызнаннем яго заслуг перад дзяржавай было б наданне імені І.М. Стэльмашонка дзіцячаму санаторыю ў Свіслачы, якую ён вельмі любіў.

Дзіцячы фестываль "Перапёлачка" стаўся б жыватворным помнікам вялікай Артысткі, якую ў дзяцінстве прывозілі да родных у Свіслач, дзе яна, вядомая ўсяму свету, вылучалася ў Асіповіцкай акрузе кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР.

Грамадская ініцыятыва прапануе больш за два дзесяцігоддзі слушную ідэю стварэння ў Свіслачы Цэнтра экалагічнай эстэтыкі "Рагнеда", які паслужыць халістычнай адукацыі насельніцтва, свярджаючы істотнае: усё ў свеце звязана і знітавана [7]. Некалі Рагнеда вярнула да



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жыцця Полацкае княства, так і цяпер гэтае Імя ў Вечнасці, за якім – Адраджэнне, здольнае да ўваскрэсення і Свіслачы, і Беларусі.

Безумоўна, дадзены канструкт сфармуе прыязны імідж Свіслачы, расставіўшы акцэнты аб сапраўднасці паселішча як спрадвечнага Цэнтра [9] пры сутоку рэк Свіслачы і Бярэзіны, у цэнтры Беларусі і Еўропы.

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. https://libeldoc.bsuir.by/bitstream/123456789/49382/1/Baranovskii_Primenenie
2. Тихомиров, М.Н. Список русских городов дальних и ближних. (Русское летонисание). М., Наука,1979, http://www.russiancity.ru/books/b72.htm.
3. https://osipovichi-region.by/istoriya/poslednyaya-vladelicza-imeniya-svisloch/
4. https://www.bsmu.by/page/11/2646/.
5. https://zviazda.by/news/20250418/1744993071-chym-pryvablivae-dzicyachy-sanatoryy-u-asipovickay-svislachy
6. Сакава, Н. Цэнтр экалагічнай эстэтыкі “Рагнеда” // Пазашкольнае выхаванне. Навук.-метад., інфармац. часопіс. РУП / Адукацыя і выхаванне/. № 3 (104), 2009.
7. Рашэнне Беларускага рэспубліканскага навукова-метадычнага савета на пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь (пратакол № 112 ад 27.09.2005.
8. Сакава, Н. Л. Канцэпцыя экалагічнай эстэтыкі ў выхаваўчым і навучальным працэсе на шляху да стварэння Цэнтра халістычнай адукацыі насельніцтва як від сацыяльнай інавацыі. Н.Л. Сакава / Инновации в современном образовании:опыт и перспективы. Сб. материалов Межд. научно-практ.конф. 30.10.2014 г. Могилёв. Ч. 3 / Ред. сов.: И. А. Старовойтова и др. – Могилёв: УО “МГОИРО”, 2014. – 106 с.
9. Сакава, Н. Л. Свіслач як цэнтр гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі / Н. Л. Сакава / Куляшоўскія чытанні : сборник научных статей по материалам Международной научно-практической конференции, Могилев, 18-19 апреля 2019 г. / под ред. Т. В. Мосейчук. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2020. – С. 53-59.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова